Ў дзень сьвята беларускай дзяржаўнасьці, мы беларусы з болям у сэрцы перажываем няволю нашага народу і адначасна моцна верым, што па Промыслу Божаму яна кончыцца. Гасподь Бог вялік у Сваёй міласьці! Дык молім Яго і просім Яго дапамогі з надзеяй, што словы вялікага Вучыцеля любові — Спасіцеля сьвету: „Запраўды, запраўды кажу вам, што, аб чым папросіце Айца ў імя Маё, дасьць вам" — споўняцца і над нашым краям засьвеціць сонца волі, сонца свабоды і незалежнасьці. Гасподзь Бог нявідзіма прабывае сярод нас. Ён усюдыпрабываючы! Няма куточка ўсяленнай, дзе Ён непрысутнічае. Няма хаты, ці палацу, у якіх шукаючыя пацехі і дапамогі былі-б забытыя Ім. Так, як усемагутны і ўсюдыпрабываючы ёсьць Бог, так усюдыпатрэбнай ёсьць малітва. Няма ніводнае дзялянкі нашага жыцьця, дзе-б не праяўлялася магутнае дзеяньне малітвы да Госпада Бога. Малітва да Бога, любоў да Яго, добрае хрысьціянскае жыцьцё — зможа зьніскаць Бажэсьцьвенную благадаць і благаслаўленьне для нас і нашай вызвольнай барацьбы. Словы, „змагайся за Бацькаўшчыну і маліся" — няхай будуць клічам нашым, і пакуль яшчэ ня скончыліся дні няволі і цярпеньня, няхай змусяць кожнага з нас змагацца і маліцца Богу, „да не отвраціць Ён да канца Ліцэ Сваё ад нас, но да воспомянет шчэдроты Своя і помілует нас". І тады скончыцца панаваньне над нашым краям бальшавіцкага захопніка.

Скончыцца панаваньне голаду, мору, агню і мяча.

Скончыцца апусташэньне нашай зямлі і рабаваньне яе векавога нацыянальна-культурнага багацьця.

Скончыцца панаваньне няволі, прымусу, забойства і катаваньня.

Скончыцца вандраваньне беларускай эміграцыі па далёкіх чужынах.

Скончыцца панаваньне чырвонага дракана, які сваёй бязбожнай камуністычнай прапагандай ілжы і ашуканства атручвае міліёны людзей усяго сьвету.

Скончыцца на Бацькаўшчыне люты прасьлед нашай Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы і яе вернікаў.

Скончыцца кашчунства, сьвятатацтва і богахульства.

Бог усемагутны! Немагчымае чалавеку, магчымае Богу. Дык шчыра і горача ўсе бяз вынятку молімся да яго: „Многаміласьцівы Божа! Пачуй сумуючых і церпячых няволю рабоў Тваіх маляшчыхся Табе; узглянь нашы сьлёзы, як узглянуў некалі сьлёзы беднай наінскай удавы, і як над ей — змілуйся над намі! Дай нам убачыць вялікае чуда ўваскрасеньня і адраджэньня Бацькаўшчыны нашай, каб і мы з „благоговейным трепетом" пакланіліся перад веліччу сілы Тваей, і ў сардэчным уміленьні і ўдзячнасьці іспаведывалі, яко „дзесніца Господня спасе нас" і „яко посеці Бог людзей Сваіх" (Лукаш 7, 16).

Протапрэсьвіцер М. Лапіцкі

STATEMENT BY D. KASMOVICH, CHIEF OF MILITARY DEPARTMENT OF BYELORUSSIAN CENTRAL COUNCIL, STUTTGART, GERMANY

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА
ГАЛОЎНАЯ КВАТЭРА БЕЛАРУСКАГА ВЫЗВОЛЬНАГА ФРОНТУ
Штутгарт, Нямеччына

Дарагія сябры Беларускага Вызвольнага Фронту і ўсе суродзічы!

У гістарычны дзень 25-га сакавіка вітаю Вас з 40-мі ўгодкамі абвешчаньня Беларускай Рэспублікі суверэннай дзяржаваю.

25-га сакавіка 1918 году беларускі народ, вуснамі сваіх найлепшых сыноў, заявіў усяму сьвету, што Беларусь жыве і ўваходзіць у сямью вольных народаў сьвету як раўнапраўная, вольная дзяржава.

Гэтую сваю волю беларускі народ пацьвердзіў яшчэ раз 27-га чэрвеня 1944 г. на 2-м Усебеларускім Кангрэсе ў Менску, выбраў носьбіткай суверэнных правоў беларускага народу — Беларускую Цэнтральную Раду.

У імя незалежнасьці, на загад народу, ўзяліся за зброю сыны Беларусі. Беларускія жаўнеры складалі на аўтар Бацькаўшчыны сваё жыцьцё, каб жыла Беларусь.

Бальшавіцкі тыран фізычна паканаў наш народ. Аднак сілы беларускай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі ён не паканаў і ніколі ня зможа паканаць.

Гэтая ідэя, узгадаваная на гісторыі, традыцыі і культуры слаўнай нашай мінуўшчыны, падмацаваная міліёнамі нашых мучанікаў за яе, — глыбака ўкаранілася ў сэрцы беларускага народу.

Ніякая людзкая сіла не пакане яе. Наадварот, тэррор і няволя яшчэ мацней пабуджаюць усе нацыянальныя сілы згуртавацца шчыльней на барацьбу з чырвоным катам.

Будзьма-ж заўсёды гатовымі ў патрэбную хвіліну прыняць аканчальны бой, каб жыла Беларусь!

Жыве Беларусь!

Сакавік, 1958 г.

(—) Д. Касмовіч
Кіраўнік Вайсковага Аддзелу Выканаўчага Воргану
БЦР і Начальнік Галоўнага Штабу БВФ

GREETING BY MR. KARSHUN, LEADER OF BYELORUSSIAN PARTY FOR INDEPENDENCE, GERMANY

Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Партыі
дн. 15. 3. 1958 г.

№ 51/58.

ПРЭЗЫДЫЮМУ ПАЧЭСНАЙ АКАДЭМІІ СЬВЯТКАВАНЬНЯ 40-Х УГОДЧАЎ АБВЕШЧАНЬНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ
Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі

Дарагія Суродзічы!

Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Партыі шчыра вітае ўсіх сваіх сяброўак і сяброў, а так сама ўсіх беларусак і беларусаў,

пражываючых у Паўночнай Амэрыцы, з 40-мі ўгодкамі абвешчаньня Беларусі Незалежнаю Дзяржаваю.

Мы перакананыя, што ня гледзячы на тое, што шмат хто ўжо прыняў амэрыканскае грамадзянства, але ён захаваў ў сваіх грудзях вернасьць і каханьне да роднага краю.

Барацьба з бальшавіцка-камуністычным акупантам, які паняволіў наш край, ёсьць сьвятым абавязкам усей беларускай эміграцыі, усяго беларускага народу.

Беларуская Незалежніцкая Партыя, якая яшчэ на Бацькаўшчыне распачала гэтую няроўную барацьбу, не пакіне гэтага змаганьня, пакуль камунізм ня будзе зьнішчаны і Бацькаўшчына наша не здабудзе вольнасьці і незалежнасьці.

У гэты гістарычны дзень Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Партыі прызывае спалучыць усе матар'яльныя і духовыя сілы беларусаў, пражываючых за межамі Бацькаўшчыны, і пад праваднiцтвам Беларускай Цэнтральнай Рады, легітымнага прадстаўніцтва Беларускага Народу, задзіночанай і здысцыплінаванай грамадою далей вясьці барацьбу за лепшую долю свайго народу.

Хай жыве вольная і незалежная Беларуская Рэспубліка!

Нямеччына, сакавік, 1958 г.

(—) **Каршун**
Кіраўнік Партыі

GREETING BY L. HOLAK, CHAIRMAN OF THE COMMITTEE FOR INDEPENDENT BYELORUSSIA

Стамфорд, 25 сакавіка 1958 г.

З нагоды 40-ых угодкаў аднаўленьня незалежнай Беларускай Дзяржавы дня 25 сакавіка 1918 г., Камітэт Незалежнай Беларусі, успамінаючы з глыбокай пашанай і сумам усіх беларусаў, якія згінулі на працягу апошніх 40 гадоў у змаганьні з акупантамі за зьдзейсьненьне Акту 25 Сакавіка, перасылае шчырыя прывітаньні ўсяму Беларускаму Народу.

Камітэт Незалежнай Беларусі заклікае Беларускі Народ, як на Беларусі, так і ў мясцох рассяленьня ў вольным сьвеце, і надалей не спыняць змаганьня з расейскім акупантам нашай бацькаўшчыны.

Камітэт зьвяртаецца да беларускай эміграцыі з заклікам да скоардынаваньня на дэмакратычных асновах сваіх нацыянальна-вызвольных высілкаў, накіраваных на змаганьне з расейскім бальшавізмам, для большай пасьпяховасьці гэтага змаганьня.

Л. Галяк
Старшыня Камітэту Незалежнай Беларусі

GREETING BY BYELORUSSIAN AMERICAN NATIONAL COUNCIL IN CHICAGO, U.S.A.

25 сакавіка 1958 г.

Старшыні Беларускага Кангрэсавага Камітэту ў Амэрыцы.

У дзень 40-х угодкаў абвешчаньня Беларусі Вольнай і Незалежнай Дзяржавай, Урад Беларуска-Амэрыканскай Нацыянальнай Рады шле Вам найшчырэйшыя пажаданьні ў Вашай грамадзкай працы на карысьць нашага шматпакутнага Беларускага Народу. Няхай паходня запаленая 25 Сакавіка 1918 году і надалей ярка асьвятляе шлях Вашага няўтомнага змаганьня аж да канчальнага вызваленьня нашае Бацькаўшчыны з пад маскоўска-бальшавіцкага панаваньня!

(—) **В. Пунтус**
Сакратар Беларуска-Амэрыканскай Нац. Рады

GREETING BY A. PLESKACHEVSKY, CHAIRMAN OF BYELORUSSIAN DIVISION OF AMERICAN FRIENDS OF THE ANTIBOLSHEVIK BLOC OF NATIONS

БеларускіАддзел Амэрыканскіх Прыхільнікаў А.Б.Н.
Ірвінгтон, Н. Дж.

25 Сакавіка 1958 году.

Старшыні Сьвяткавальнага Камітэту 40-х Угодкаў Абвешчаньня Незалежнае Беларусі

У 40-выя угодкі абвешчаньня несьмяротнае 3-яе Устаўнае Граматы 25-га Сакавіка, перасылаю Вам, і ўсім беларусам, шчырыя прывітаньні з як найлепшым пажаданьнем найбольшага нацыянальнага аб'яднаньня на шляху няўтомнага змаганьня за Яе ідэалы аж да канчальнага вызваленьня Беларусі з пад расейска-камуністычнага панаваньня.

Сьмерць камунізму! Жыве вольная Беларусь!

(—) **А. Плескачэўскі**
Старшыня А.П. А.Б.Н.

STATEMENT BY REGIMENT STAFF OF BYELORUSSIAN LIBERATION FRONT IN CLEVELAND, U.S.A.

25 сакавіка 1958 г.

Старшыне Беларускага Кангрэсавага Камітэту у Амэрыцы.
Высокапаважаныя Га-ні і Гаспадары,
Браты па зброі ў барацьбе за Волю і Незалежносьць!

Краёвы Штаб Беларускага Вызвольнага Фронту ў Амэрыцы гэтым вітае ўсіх Вас з Днём Вялікага Акту 25 Сакавіка і з гэтай нагоды жадае ўсім Вам добрага здароўя і вялікіх посьпехаў у барацьбе за вызваленьне нашай Бацькаўшчыны БЕЛАРУСІ.

Наш беларускі народ ужо на працягу 40-а гадоў вядзе бязупынную барацьбу супроць чырвонага акупанта, які паняволіў наш Край і Народ, але мы моцна верым, што кроў нашых братоў, пралітая ў барацьбе за незалежнасьць Беларусі, ня пойдзе дарам, і мэта, за якую гадамі змагаемся, будзе асягнута: народ наш вызваліцца з-пад чужой акупацыі, а Беларусь будзе вольнай і незалежнай дзяржаваю.

Кліч кінуты беларускім народам: Вольнасьць і Незалежнасьць, гарыць у сэрцах усяго нашага народу і гэтым сьведчыць усяму сьвету, што беларускі народ жыве і змагаецца! Хай ведаюць чырвоныя каты, што наступіць з імі дзень РАСПЛАТЫ.

Мы, беларускія вайскоўцы, пражываючыя ў ЗШАмэрыкі, і аб'едданыя ў рады Беларускага Вызвольнага Фронту, кіраванага Беларускай Цэнтральнай Радай, запэўняем Вас, дарагія суродзічы, што мы будзем заўсёды гатовыя выканаць свой жаўнерскі абавязак перад нашай Бацькаўшчынай

каўшчынай. Штандар Вызваленьня падняты ў гору мы горда данясём да аканчальнай перамогі над ворагамі.

Няхай Жыве Ідэя Акту 25 Сакавіка!
Няхай Жыве Беларусь і Яе Народ!
Няхай Жыве Беларуская Цэнтральная Рада!

Капітан Я. Говша
Начальнік Краёвага Штабу БВФ

Ст. лейтэнант У. Лазар
Заступнік Начальніка КШ БВФ

Др. М. Латушкін
Кіраўнік Канцыляры КШ БВФ

GREETING BY BYELORUSSIAN NATIONAL ASSOCIATION IN CANADA

З нагоды 40-ой гадавіны абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі перасылаем Беларускаму Народу ў Паняволеным Краі і Беларускай эміграцыі, пажаданьні вытрываласьці ў змаганьні за волю і аднаўленьне Беларускай Незалежнай Дзяржавы.

Жыве Беларусь!

Беларускае Нацыянальнае Аб'яднаньне ў Канадзе

25 сакавіка, 1958 г.

STATEMENT BY CAPT. S. ROZMYSL, CHIEF OF REGIMENT STAFF OF THE BYELORUSSIAN LIBERATION FRONT IN AUSTRALIA

Краёвы Штаб Б.В.Ф. у Аўстраліі — Мэльбурн, сакавік, 1958 г.
№ 11/58.

Старшыні Прэзыдыуму Урачыстай Акадэміі прысьвечанай 40-м угодкам абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі, Нью-Йорк.

Высокапаважаныя Гасп-ні і Гаспадары!

Краёвы Штаб Б.В.Ф. у Аўстраліі, ў 40-ыя ўгодкі абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі Актам 25-га Сакавіка, перасылае Вам найшчырэйшыя пажаданьні якнайхутчэйшага зьдзейсьненьня гэтага векапомнага акту і павароту на вольную і незалежную Беларусь.

Мінула 40 доўгіх гадоў з таго часу, калі Беларусь была абвешчана Незалежнай Дзяржавай, але Беларускі Народ усьцяж знаходзіцца пад жорсткім акупантам, які крывавым тэррорам хоча выкараніць з беларускіх сэрцаў волю да самастойнага жыцьця.

Браты, не па тое мы пакінулі Родную Краіну, каб жывучы ў дастатках на эміграцыі забыцца пра сваіх бацькоў, братоў дый дзяцей, якія пакутуюць пад ярмом крывавага камуністычнага прыгону. Не, мы выйшлі з Бацькаўшчыны па тое, каб пад аховай дэмакратыі далей працаваць у напрамку зьдзейсьненьня Акту 25-га Сакавіка, а ў выпадку патрэбы ўзяцца за зброю, каб у змаганьні здабыць Незалежнасьць Беларусі.

Хай жыве Вольная і Незалежная Беларусь!
Хай жыве Шматпакутны Беларускі Народ!

(—) Кап. С. Розмысл
Нач. Кр. Шт. Б.В.Ф. у Аўстраліі

(Пячатка)

STATEMENT BY THE UNITED CHRISTIAN BYELORUSSIAN WORKERS IN GREAT BRITAIN

ХРЫСЬЦІЯНСКАЕ АБ'ЕДНАНЬНЕ БЕЛАРУСКІХ РАБОТНІКАЎ У ВЯЛІКАЙ БРЫТАНІІ, ЛЁНДАН

Старшыні Прэзыдыюму Урачыстае Акадэміі прысьвечанай 40-ым угодкам 25-га Сакавіка ў СШПАмэрыкі

З нагоды саракагодзьдзя абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, Галоўная Управа Хрысьціянскага Аб'еднаньня Беларускіх Работнікаў у Вяліка-Брытаніі гэтым шле сваё шчырае прывітаньне ўсім беларускам і ўсім беларусам, якія сьвяткуюць гэты ўрачысты для нас дзень па-за межамі Беларусі.

Барацьба за вызваленьне нашае Бацькаўшчыны яшчэ не закончана, а таму жаданьнем усіх тых, каму пашчасьлівіла апынуцца ў вольным сьвеце, ёсьць далажыць найбольшых высілкаў за зьдзейсьненьне ідэалаў, якія былі абвешчаны гістарычнаю Радаю Беларускай Народнай Рэспублікі 40 год таму — 25 сакавіка 1918 году.

Вызваленьне Беларусі, акупаванай сёньня чырвонаю Масквою, ды аднаўленьне яе дзяржаўнага сувэрэнітэту, было і ёсьць нязьменнаю мэтаю змаганьня ўсяго беларускага народу.

Напоўнім-жа ў гэты вялікі ўрачысты дзень нашыя душы надзеяй у хуткую перамогу ды раздмухаем у сваіх сэрцах прыгаслае полымя веры ў справядлівасьць, бо-ж толькі гэта дасьць нам сілы працягваць вызвольную барацьбу да пераможнага канца!

Няхай Жыве Вольная Сувэрэнная Беларуская Народная Рэспубліка!
Няхай Жыве Беларускі Народ!

(—) Ю. Весялкоўскі
Сакратар

(Пячатка)

(—) Б. Суравы
Старшыня

GREETING BY WHITERUTHENIAN (BYELORUSSIAN) CONGRESS COMMITTEE OF AMERICA TO THE BYELORUSSIAN DIVISION OF ANTIBOLSHEVIK BLOC OF NATIONS IN BRAZIL

25 сакавіка, 1958 г.

Беларускаму Аддзелу Антыбальшавіцкага Блёку Народаў у Бразыліі, на рукі грам. Міколы Карпоўскага

Паважаныя Грамадзяне Беларусы!

Ад імя Беларускага Кангрэсавага Камітэту Амэрыкі вітаем Вас з Вялікім і памятным днём для Беларускага Народу — з днём 25 САКАВІКА, з слаўным юбілеям 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Толькі ў сваей незалежнай дзяржаве Беларускі Народ:

1) зможа сам справядліва кіраваць сваім жыцьцём, згодна са сваей воляй і патрэбамі;

2) будзе ў стане не дапушчаць да выкарыстоўваньня сябе праз іншыя народы;

3) зможа вольна разьвіваць сваю нацыянальную гаспадарку і культуру, робячы свой уклад у гісторыю агульналюдзкага прагрэсу.

У імя гэтых высокіх ідэалаў Беларускі Народ змагаецца ўжо 40 гадоў супроць акупантаў, за рэалізацыю АКТУ 25 САКАВІКА. Гэтае змаганьне будзе трываць аж да поўнае перамогі, да вызваленьня Беларусі з пад акупацыі Савецкай Расеяй ды адбудовы Незалежнай Беларускай Дзяржавы.

Хай жыве вызвольнае змаганьне Беларускага Народу супроць бальшавіцкага акупанта!

Хай жыве Беларускі Народ!

ADDRESS DELIVERED BY DR. J. ERMACHENKO, FORMER MEMBER OF GOVERNMENT OF THE BYELORUSSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC, IN NEW YORK CITY AT THE 40th ANNIVERSARY OF THE PROCLAMATION OF BYELORUSSIA'S INDEPENDENCE

ПРАМОВА Д-РА І. ЕРМАЧЭНКО НА ЎРАЧЫСТАСЬЦІ 40-Х УГОДКАЎ АБВЕШЧАНЬНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ, Ў НЬЮ-ЙОРКУ 30 САКАВІКА 1958 Г.

Высокапаважаны грамадзянін Прэзыдэнт акадэміі!

Высокапаважаныя госьці, прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў!

Дарагія грамадзянкі і грамадзяне БЕЛАРУСЫ!

Сяньня я маю гонар выступіць перад Вамі, каб адзначыць 40-агадовы слаўны юбілей абвешчаньня Беларусі вольнай і незалежнай Народнай Рэспублікай.

Роўна 40 год таму назад, дня 25-га сакавіка 1918 году Рада Беларускай Народнай Рэспублікі ўрачыста прыняла Трэцюю Ўстаўную Грамату, якой парываліся сувязі Беларусі з Расеяй і праклямавалася поўная незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэты векапомны акт стаўся крыніцай вялікай сілы і ясным паказьнікам напрамку ў нашай барацьбе праз усе 40 гадоў, бо ўся дзейнасьць беларусаў была ськіраваная на рэалізацыю тых вялікіх ідэалаў, якія былі пастаўленыя Актам 25-га Сакавіка.

На вялікі жаль, мне не давялося быць удзельнікам у гістарычным паседжаньні Рады Б.Н.Р., абвесьціўшым незалежнасьць Беларусі. Я належыў да дыплёматычнага корпусу, а пазьней я быў сябрам ураду Беларускай Народнай Рэспублікі. Паколькі мне ведама, то на сягоньня толькі я адзін і застаўся пры жыцьці з сяброў ураду гістарычнае Беларускае Народнае Рэспублікі, а ўсе іншыя часткова памёрлі, а ў вялікай бальшыні яны згінулі ад куляў ЧЭ-КА, ГПУ ці НКВД, або памёрлі у бальшавіцкіх турмах, ці канцэнтрацыйных лягерох, не дачакаўшыся зьдзейсьненьня сваіх ідэалаў.

Пра гістарычнае паседжаньне Рады Б.Н.Р. 25-га сакавіка 1918 г. пісалася шмат у нашай адраджэнскай літаратуры. Але пра дзейнасьць ураду Беларускай Народнай Рэспублікі на бацькаўшчыне, ці ў Коўне, як і на эміграцыі-ведама менш. Я пастараюся сягоньня даць насьветленьне гэтай галіны нашай гісторыі, паколькі мне дазваляе мая памяць з асабістага ўдзелу ў дзейнасьці тых часоў. Нашы дзяржаўныя архівы засталіся ў Беларускім Архіве ў Празе і сяньня недаступны да карыстаньня, таму мне прыходзіцца абмяжавацца да собскіх успамінаў.

У выніку ваенных і рэвалюцыйных падзеяў Першай Сусьветнай Вайны у 1920 г. я апынуўся у Канстантынопалі ў Турэччыне. У той час у Канстантынопалі апынулася шматтысячная эміграцыя розных нацыянальнасьцяў, а паміж імі было шмат беларусаў, як жаўнераў, так і афіцэраў, якія жадалі выехаць на бацькаўшчыну, ці ў якую небудзь іншую краіну для сталага пасяленьня. Для дапамогі беларускім эмігрантам у 1921 г. там быў створаны Беларускі Камітэт, з грамадзянінам Базарэвічам на чале.

Мне было даручана паехаць у Коўню для навязаньня лучнасьці з урадам Беларускай Народнай Рэспублікі. Падарожжа ў Коўню было вельмі цяжкае. Прыехаўшы ў Бэрлін я быў вельмі ветліва прывітаны бэрлінскім прадстаўніцтвам ураду Беларускай Народнай Рэспублікі ў васобах: пасла, грамадзяніна Баркова, і гандлёвага атташэ грам. Лур'е. Аднак, яны ніяк не маглі атрымаць для мяне візы праз польскі „калідор" у Коўню, бо адносіны паміж нашым урадам і польскім урадам ня былі добрыя. Толькі праз два месяцы я нарэшце атрымаў візу і выехаў у Коўню. Прыбыўшы у Коўню я зрабіў шырокі даклад Прэзыдэнту Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, П. Крэчэўскаму і на агульным паседжаньні Рады і Ўраду Б.Н.Р. зрабіў прапанову адчыніць Прадстаўніцтва Б.Н.Р. на Балканах, з галоўнай сядзібай у Канстантынопалі і консульствамі ў Баўгарыі і Югаславіі. Прэзыдэнт і ўвесь урад аднагалосна акцэптавалі маю прапанову і я атрымаў намінацыю, падпісаную грам. В. Ластоўскім, Старшынёй Ураду Б.Н.Р., на Дыплёматычнага Прадстаўніка Беларускага Ўраду ў Канстантынопалі і Генэральнага Консуля Беларусі на Балканах.

Належыць адзначыць вялікую ахвярнасьць і геройства Беларускага Ўраду і ўсяго беларускага нацыянальнага грамадзтва ў барацьбе за незалежнасьць Беларусі. Ані аружны разгон бальшавіцкай Масквой Першага Ўсебеларускага Кангрэсу, ані сталая вайна бальшавіцкіх арміяў за апанаваньне Беларусі, не зламілі духа беларускага кіраўніцтва. Ня могучы прабываць на Беларусі, Рада Б.Н.Р. з Прэзыдэнтам Рады Пятром Крэчэўскім, Заступнікам Старшыні В. Захаркай, Бадуновай, Мамонькам і Сакратаром Рады — Чарапуком, — апынуліся ў Коўні. Прэзыдэнт Літоўскай Рэспублікі, Смэтона, прызнаў Раду Б.Н.Р. за адзінага праўнага прадстаўніка беларускага народу і падпісаў з ім дзяржаўную ўмову на ўзаемнае падтрыманьне, даючы Радзе і Ўраду Б.Н.Р. права экстэрыторыяльнасьці; урад Б.Н.Р. меў права вызначаць сваіх дыплёматычных прадстаўнікоў пры Літоўскім і іншых урадах.

На чале ўраду Б.Н.Р. тады быў В. Ластоўскі, ягоным заступнікам і кіраўніком замежных спраў быў Аляксандра Цьвікевіч, кіраўніком аховы здароўя быў Іван Цьвікевіч, кіраўніком нутранных спраў быў Тамаш Грыб, кіраўніком гандлю — Лур'е (супрацоўнік — Бароўскі), дзяржаўным кантралёрам — Лявон Заяц, і грамадзянін Пракулевіч — без партфэля. Дзеілі прадстаўнікі па сувязі з Беларусяй, акупаванай у

той час праз бальшавікоў і палякаў, а паміж імі былі: грам. Душ-Душэўскі і Васіль Русак.

У той час урад Б.Н.Р. меў сваіх дыплёматычных прадстаўнікоў у наступных краінах: у Бэрліне (Нямеччына) грам. Баркоў, у Коўне (Літва) грам. Вальковіч, у Рызе (Лацьвія) грам. К. Езавітаў, у Празе (Чэхаславачына) грам. Вяршынін, у Канстантынопалі (Турэччына) вызначаны палкоўнік І. Ермачэнко.

Найлепшыя ўмовы для працы беларускага дыплёматычнага прадстаўніцтва былі ў Коўні, гдзе, на аснове ўмовы паміж урадамі Б.Н.Р. і Літоўскім, яно карыстала з усіх дыплёматычных правоў, якія належуць для прадстаўніцтва сувэрэннай дзяржавы.

Палагодзіўшы ўсе справы з урадам Б.Н.Р. я выехаў у Канстантынопаль, карыстаючы дыйлёматычным пашпартам Б.Н.Р. Хаця польскі ўрад адмовіў прызнаць дэ-юрэ Беларускую Народную Рэспубліку, аднак, ягоныя прадстаўнікі прылажылі пячатку на маім пашпарце і я без перашкод праехаў праз польскі „калідор". Характэрна было захаваньне польскага ўрадніка на граніцы, які затрымаўся даўжэй над беларускім пашпартам, бо відаць ніколі яшчэ такога не бачыў; аднак ён паўстрымаўся ад крытыкі, бо на пашпарце была пячатка польскага ўраду.

У палове 1921 году я прыехаў у Канстантынопаль і разам з мясцовым Беларускім Камітэтам была распачатая праца. Тут я павінен пазнаёміць вас з тэй сытуацыяй, якая была ў Канстантынопалі у 1921 годзе.

Па заканчэньні Першай Сусьветнай Вайны Канстантынопаль быў акупаваны праз саюзьнікаў і падзелены на 5 зонаў: Амэрыканскую, Ангельскую, Францускую, Італьянскую і Грэцкую. Тэрыторыяльны падзел на зоны ня быў уведзены, але названыя дзяржавы вызначылі сваіх высокіх камісараў, якія працавалі незалежна. Я быў вызначаны прадстаўніком ураду Б.Н.Р. пры турэцкім урадзе — „сюблім порта", але галава Турэцкай дзяржавы, султан Абдул Гамід, меў забарону прымаць чужаземных прадстаўнікоў у тую пару. Таму я злажыў свае акрэдытуючыя дакуманты на аўдыенцыі Старшыні Ураду — Тэффік Пашы, які высьвятліў існуючую сытуацыю і парадзіў атрымаць прызнаньне ад усіх высокіх прадстаўнікоў Антанты паасобна. Наступна я зрабіў копіі з маіх акрэдытуючых дакумантаў у Канстантынопаль і на Балканы, і на наступных аўдыенцыях злажыў іх на рукі ўсіх высокіх камісараў, з просьбай пераслаць іх адпаведна да іхніх урадаў. Праз кароткі час я атрымаў адказ ад францускага прадстаўніка, гэнэрала Пелле, паведамляючы, што францускі ўрад прызнае Беларускі Урад Б.Н.Р. дэ-факто, прызнае беларускія пашпарты, якія будзе выдаваць консульскі аддзел пры Беларускім Прадстаўніцтве ў Канстантынопалі, і дае загад усім францускім урадлнікам у Канстантынопалі і ўсім францускім консулям у Эўропе — выдаваць візы на беларускія пашпарты без ніякай перашкоды. Падчас маей аўдыенцыі з гэтай нагоды, калі гэнэрал Пелле даручаў мне афіцыйнае прызнаньне ад яго ўраду ў Парыжы, ён сказаў: „пакуль што гэтае наша прызнаньне Б.Н.Р. — дэ-факто, але ў хуткім часе наш урад, які вельмі лібэральны і стаіць на плятформе абароны незалежнасьці народаў, прызнае Б.Н.Р. таксама і дэ-юрэ".

У хуткім часе прышло прызнаньне ад італьянскага ураду; маркіз Гарроні перадаў мне дакуманты ад ягонага ўраду, ідэнтычныя з дакумантамі францускага ўраду. Наступна прышло поўнае прызнаньне ад Грэцкага ўраду для нашага прадстаўніцтва. Ангельскі і Амэрыканскі высокія камісары, падчас маей аўдыенцыі запэўнілі мяне, што яны ня будуць рабіць ніякіх перашкодаў у маей дыплёматычнай дзейнасьці, але іх урады пакуль што паўстрымоўваюцца ад афіцыйнага прызнаньня Б.Н.Р., бо яны прызнаюць польскі ўрад. Польскі ўрад мае прэтэнзыі да беларускіх тэрыторыяў і пакуль гэта справа ня вырашыцца на Парыскай Канфэрэнцыі, то яны ня могуць прызнаць Б.Н.Р.

Наступна я зрабіў візыты ўсім іншым дыплёматычным прадстаўніком і консулям і атрымаў ад усіх запэўненьне, што беларускія пашпарты будуць карыстацца роўнай пашанай, як і пашпарты іншых дзяржаў.

Каля паловы 1921 г. я адчыніў сваё бюро, на пачатку разам з Літоўскім, на чале якога быў добры прыяцель беларускага народу, капітан Блавешчунас, які шмат дапамагаў пры маіх пачатках працы. Прадстаўнік Эстонскага народу, граф. Дзірне, таксама вельмі прыхільна ставіўся да беларускай справы. У хуткім часе нашае прадстаўніцтва ў Канстантынопалі наведаў Літоўскі пасол у Бэрне — Швайцарыі, Сідзікаўскас, які таксама вельмі прыхільна паставіўся да нашае справы і абяцаў нам дапамагаць. Вельмі прыязныя адносіны былі з пасломУкраінскай Дзяржавы — Токар-Токаржэвскім-Карашэвіч, які горача падтрымліваў нас усюды, дзе магчыма. Належыць адзначыць, што праз увесь час маей працы украінцы, як браты, заўсёды былі па нашым баку. Так было ў Канстантынопалі, у Празе, у Парыжы — на шматлікіх міжнародных канфэрэнцыях, дзе я бараніў інтарэсы беларускага народу, украінцы побач змагаліся за свае нацыянальныя інтарэсы, супрацоўнічаючы і адстоіваючы нашы супольныя інтарэсы, як родныя браты.

Па адчыненьні консульскага аддзелу я паставіў на яго чале грам. Аўчыньнікава, сакратаром быў грам. Лазарэвіч, а другім сакратаром быў грам. Абрамовіч. Праца консульскага аддзелу была вельмі вялікай: шмат беларускіх афіцэраў і жаўнераў было рэпатрыяваных ў беларускі баталіён, ці на пражыцьцё у Літву, шмат эміўгравала ў Амэрыку і іншыя дзяржавы, гдзе яны атрымалі працу і засталіся на пастаянна. Усе гэтыя эмігранты выяжджалі з беларускімі пашпартамі, якія ў тыя часы наагул афіцыйна прызнаваліся і візаваліся без перашкод.

Па наладжаньні працы кансуляту ў Канстантынопалі я зрабіў падарожжа ў Баўгарыю і Югаславію, гдзе адчыніў консульскія аддзелы, з мэтай дапамогі беларусом у рэпатрыяцыі і эміграцыі. Па рэкамандацыі Беларускага Камітэту, у Баўгарыі быў устаноўлены кіраўніком

консульскага аддзелу гэнэрал Галубінцаў, а ў Югаславіі — капітан, прозьвішча якога не памятаю. Я даў ім адпаведныя інструкцыі ў паразуменьні з міністрамі замежных справаў Баўгарыі і Югаславіі і праца разгарнулася. З атрымліваных рэгулярна справаздач я бачыў, што беларуская справа карыстаецца пашанай у адпаведных установах, а беларусы атрымліваюць апеку і падтрыманьне.

У маей кансулярнай працы прайшоў 1921 і палова 1922 году, калі міністар замежных справаў Б.Н.Р. др. Іван Цьвікевіч выклікаў мяне ў Коўню, дзе прызначыў мяне на становішча заступніка міністра замежных справаў для падарожжаў па іншых дзяржавах. Гэту функцыю я поўніў праз увесь час аж да разьвязаньня ураду ў 1925 г., што звольніла мяне з гэтага становішча.

Дачыненьні Літоўскага ўраду і ўраду Б.Н.Р. надалей заставаліся добрымі. Трохі раней беларуская дэлегацыя прабывала ў Парыжы, стараючыся бараніць беларускую справу на міравой канфэрэнцыі. Літоўцы дапамагалі ей у гэтым, будучы зацікаўленымі ў справе Вільні. Беларуская дэлегацыя трымалася погляду, што Вільня належыць да Беларусі. Калі-ж беларускі ўрад апынуўся на эміграцыі, то яго становішча было за тым, каб Вільня належыла лепш да Літвы, чым да Польшчы.

Пры Літоўскім урадзе было створана міністэрства па Беларускіх Справах, з міністрам грам. Семашка на чале. У мястэчку Вількавішкі быў стацыянаваны беларускі батальён, укамплектаваны з жаўнераў і афіцэраў прыбылых пераважна з Канстантынопалю; на чале батальёну быў беларускі маёр Ружанцоў.

У верасьні 1921 г. Рада і Урад Б.Н.Р. пастанавілі склікаць шырэйшую нараду з беларускіх дзеячоў з краю і заграніцы. Каб даць магчымасьць прыехаць дэлегатам і з пад польскай акупацыі, мейсцам канфэрэнцыі прызначылі Прагу Чэскую. Прэзыдэнт Масарык прыхільна ставіўся да беларускай праблемы, даў дазвол на кангрэс, і фінансавае падтрыманьне. На кангрэс прыбыло шмат беларускіх дэлегатаў з родных земляў і з эміграцыі. Полёнофілы з Паўлюкевічам на чале, стараліся накінуць кангрэсу полёнофільскую тэндэнцыю, — што толькі супрацоўніцтвам з палякамі магчыма вырашыць беларускае пытаньне; без падтрыманьня справа ня пойдзе наперад; трэба быць практычнымі, а не ідэалістымі і г. д. Аднак 95% дэлегатаў адкінулі рэзалюцыю полёнофілаў, а прынялі пастанову аб тым, што Беларусь павінна быць вольнай і незалежнай, захоўваючы добрасуседзкія дачыненьні з іншымі дзяржавамі, але ніколі — як частка якой небудзь дзяржавы.

Трэба адзначыць радасны факт, што шмат дэлегатаў з пад польскай акупацыі не баяліся адчынена галасаваць за рэзалюцыю, у якой дамагаліся незалежнасьці Беларусі, як: Пігулеўскі, Тарашкевіч, Станкевіч і іншыя.

На кангрэсе былі: заступнік прэзыдэнта Масарыка, прадстаўнікі галоўных чэскіх палітычных партыяў, якія віталі імкненьні кангрэсу да незалежнасьці Беларусі. Чэскі урад пастанавіў даць права экзылю Радзе і Ураду Б.Н.Р., і дапамагчы беларусам з краю вучыцца ў высокіх школах, даючы фінансавую дапамогу са скарбу дзяржавы.

У верасьні 1922 году дачыненьні Ураду Б.Н.Р. з Літоўскім урадам папсаваліся, бо ліцьвіны пераканаліся, што, па акупацыі Вільні праз польскага гэнэрала Жэлігоўскага, яны не патрабуюць нашай дапамогі пры сваіх захадах адносна Вільні. Літоўцы заявілі, што ім трэба утрымліваць добрыя дачыненьні з палякамі і таму яны ня могуць надалей прызнаваць за Беларускім Урадам права экстэрыторыяльнасьці у Коўне. Таму Рада і Урад Б.Н.Р. амаль поўнасьцю выехалі ў Прагу. У Коўні застаўся Ластоўскі, які займаўся культурнымі справамі, выдаючы часапіс „Крывія”, слоўнік і інш., не маючы урадавага становішча Б.Н.Р.

У кастрычніку 1922 году ў Празе апынуўся Урад Б.Н.Р. з др. А. Цьвікевічам на чале. Туды-ж прыбыла і Рада Б.Н.Р. са старшынёй П. Крэчэўскім, яго заступнікам В. Захаркай, сябрамі: Бадуновай, Мамоньнькам, і інш. Я прыбыў у Прагу з сябрамі Рады. Гэтым разам палякі нам адмовілі праезд праз „калідор” і мы былі змушаныя ехаць параплавам да Штэціну, а далей праз Нямеччыну. Цяпер дзейнасьць Ураду працягвалася праз прадстаўніцтвы ў паасобных краінах, а так сама шляхам мэмарандумаў у Лігу Нацыяў і да спрыяючых дзяржаў.

У пэрыюд НЭП-у на падсавецкай Беларусі нацыянальны беларускі актыў разгарнуў значную нацыянальна-культурную дзейнасьць. Было створана беларускае школьніцтва ад пачаткавага, да вышэйшага і Беларуская Акадэмія Навук. Беларуская культурная дзейнасьць шырака разьвівалася, паўсталі беларускія тэатры, вырасла беларуская літаратура, беларусы займалі высокія становішчы ў дзяржаўных установах. Беларусы спадзяваліся, што БССР, створаная бальшавікамі, станецца беларускім нацыянальным „домам”, што бальшавікі адмовіліся ад расейска-імпэрыялістычных мэтадаў у нацыянальнай палітыцы і пачынаюць здаровыя ўзаемаадносіны паміж народамі. Бачучы такія магчымасьці ў БССР наш урад Б.Н.Р. прыняў запрапанаваную бальшавікамі нараду ў Бэрліне ў 1925 г., куды прыбылі прадстаўнікі ад БССР, разам з беларускімі пісьменьнікамі і грамадзкімі дзеячамі. На гэтай нарадзе Старшыня Ураду Б.Н.Р., Аляксандра Цьвікевіч, запрапанаваў зьліквідаваць урад Б.Н.Р. і ехаць усім на падсавецкую Беларусь, бо толькі там ёсьць магчымасьць праводзіць нацыянальную беларускую працу. Большая частка Ураду Б.Н.Р. згадзілася з гэтай прапановай. Але Старшыня Рады Б.Н.Р., П. Крэчэўскі, яго заступнік Б. Захарка, сябра ўраду Тамаш Грыб і я — адмовіліся паверыць бальшавіцкім абяцанкам і засталіся на эміграцыі ў Празе. Мы правільна ацанілі сутнасьць бальшавіцкай палітыкі манэўраваньня ў нацыянальным пытаньні. Бальшавікі стараліся сабраць увесь беларускі нацыянальны актыў з эміграцыі ў Беларусь, каб пасьля поўнасьцю вынішчыць. Гэтае вынішчэньне нацыянальнага беларускага грамадзтва распачалося ў БССР у 1929 годзе, шляхам масавага пагрому ўсіх дзяячак жыцьця. Больш трох міліёнаў беларускай інтэлігэнцыі, сялянства і работнікаў, было расстраляна, закатавана па турмах і вынішчана па канцэнтрацыйных лягерох. Дадаткова масы беларускага народу дэпартаваліся і дэпар-

туюцца ў тайгі Сыбіру, на Казакстанскую цаліну, у капальні Калымы і г. д. Рэлігійнае жыцьцё было поўнасьцю зьнішчана. Працэс вынішчаньня нацыянальна беларускіх дзейнікаў тэррорам у БССР трывае пастаянна, прыбіраючы у пэўных одступах часу форму асабліва масавага і крывавага насіленьня.

Ня шмат лепш жылося беларусам у Заходняй Беларусі, акупаванай Польшчай. Нацыянальныя асягненьні, здабытыя беларусамі падчас Першай Сусьветнай Вайны і ў першыя гады існаваньня Польскай дзяржавы, хутка былі адабраныя палякамі. Усе беларускія гімназіі і пачатковыя школы былі зачыненыя польскім урадам. Шляхам паліцэйскага тэррору беларусы былі пазбаўлены прадстаўніцтва ў Сойме і Сэнаце, а так сама у самаўрадах. Усе беларускія палітычныя, грамадзкія, культурныя і гаспадарчыя арганізацыі і ўстановы былі разгромленыя шляхам масавага крывавага тэррору і забароненыя. Беларусаў не дапушчалася да ўрадаў і не дазвалялася купляць зямлю на бацькаўшчыне, якая прызначалася для польскае калянізацыі. Турмы і канцэнтрацыйны лягер у Бярозе Картускай былі поўныя беларускага жыхарства. Шмат беларусаў уцякала ад польскіх прасьледаў у Савецкую Беларусь, дзе яны былі вынішчаны.

Вынішчаньне нацыянальнага беларускага жыцьця на Усходняй Беларусі Савецкай Расеяй, а на Заходняй Беларусі палякамі, адбывалася па дамоўленасьці, як аб гэтым сьведчылі чуткі з тых часоў.

Падчас Другой Сусьветнай Вайны беларускі народ ізноў паўстаў да змаганьня за сваю незалежную дзяржаву. 27 чэрвеня 1944 году ў Менску сабраўся Другі Ўсебеларускі Кангрэс, які ануляваў усе папярэднія акупацыйныя пастановы чужых урадаў, датычна Беларусі; апрабаваў акт абвешчаньня Беларускай Народнай Рэспублікі; выбраў Беларускую Цэнтральную Раду за адзінае праўнае прадстаўніцтва беларускага народу, адкідаючы чужую дзяржаўную форму БССР, накіненую Савецкай Расеяй.

Праз усе апошнія 40 год беларускі народ збройна змагаўся за сваю незалежную дзяржаву. Збройныя фармацыі Беларускай Народнай Рэспублікі; Асобны Атрад гэнэрала Булак-Балаховіча; палкі Слуцкіх паўстанцаў; збройныя антыбальшавіцкія змаганьні ў Веліжы, Рагачове, Гомялі, Рэчыцы, Бабруйску і іншых мясцовасьцях; агульны супраціў беларускага сялянства супроць уводжанай бальшавікамі кал-гаснай паншчыны; збройная Самаахова; баталёны Беларускай Краёвай Абароны; грэнадзёрская штурмовая брыгада „Беларусь"; збройная акцыя беларускіх партызанскіх злучэньняў, — усе яны становяць адзін цяглы ланцуг барацьбы за рэалізацыю Акту 25-га Сакавіка, за здабыцьцё вольнай і незалежнай Беларускай Дзяржавы.

Сучасны стан на падсавецкай Беларусі не зьяўляецца поўнасьцю стабільным для савецкай акупацыйнай улады. Як аб гэтым сьведчыць публікаваны у Менску „Камуніст Беларусі" і іншыя савецкія газэты, на Беларусі жывым рэхам адбіваюцца падзеі нацыянальна-вызвольных змаганьняў іншых народаў, як гэта было з Эгіптам, Польшчай, Мадзяршчынай, спраўляючы шмат клопату савецкім уладам. Беларускі

народ ня скорыцца акупацыйнай уладзе поўнасьцю, а перахавае вялікія ідэалы ВОЛІ І НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ да першай спрыяльнай магчымасьці, калі ізноў выступіць са зброяй у руках супроць акупацыі Савецкай Расеі за сваю дзяржаўную незалежнасьць.

RESOLUTION SENT TO VERY HONORABLE DWIGHT D. EISENHOWER
President of the U.S.A.

WHITERUTHENIAN (BYELORUSSIAN) CONGRESS COMMITTEE OF AMERICA

April 8, 1958

Very Honorable Dwight D. Eisenhower
President of the United States of America
White House, Washington, D.C.

My Dear Mr. President:

The Whiteruthenian (Byelorussian) Congress Committee of America sponsored a meeting attended by Americans of Byelorussian descent, living in the States of New York, New Jersey, Connecticut and Pennsylvania, on March 30, 1958 at the Sheraton-Astor Hotel in New York City. This meeting unanimously approved and decided to respectfully present to you, Mr. President, the following resolution:

The Byelorussian people lost their statehood completely at the end of the 18th century after being conquered by Russia. However, despite the Russian policy of russification the Byelorussians preserved their national identity. After a cultural and political revival in 19th century, Byelorussia entered into the 20th century fighting for its own independence.

The First All-Byelorussian Congress in 1917 in Miensk started the restoration of the Byelorussian state, and was consequently dispersed by soldiers of Soviet Russia.

Exectly 40ty years ago, on March 25, 1918, the Rada (Council) of the Byelorussian Democratic Republic proclaimed the independence of Byelorussian Democratic Republic. From this time on the historical Act of Independence (The Third Constitutional Act) inspires the ensuing struggle of the Byelorussian people for liberation and independence. The elected Byelorussian Government organized armed forces and defended the restored Byelorussian State. However, Byelorussia was again conquered by an aggressive Soviet Russia and Poland, which divided Byelorussian territory among themselves in the Treaty in Riga in 1921.

Soviet Russia created the Byelorussian Soviet Socialist Republic, which is a fictitious state used by Soviet Russia for propaganda benefits. Byelorussian people do not have any national influence on their government affairs in the Byelorussian S.S.R.

Byelorussia suffered very heavy burdens under the Soviet Russian and Polish occupation. At the first opportunity by the end of the Second World War in 1944, the Second All-Byelorussian Congress convened in Miensk. This Congress voided all occupational treaties regarding Byelorussian territory, approved the proclamation of independence of the Byelorussian Democratic Republic and elected the Byelorussian Central Rada (Council) as the national representation of Byelorussia. Byelorussian Central Rada again launched an armed fight against the Soviet Russia. But this time all Byelorussia was conquered by Soviet Russia.

The government of Soviet Russia is continuing the imperialistic policy of the Russian Tsars. During all of the 40ty years of its existence the Soviet Russian colonial policy towards Byelorussia remains unchanged. The growing up national Byelorussian factors have being destroyed by permanent mass terror. Russians are imported in mass for the purpose of ruling the country. By using a policy of russification and sovietization Moscow is trying to change the Byelorussian nation into one undivisible Soviet Russian nation. However, this genocide process is not a success.

The Byelorussian people have been outlasted centuries of former occupations and national oppression. We believe they will also endure the present pressure, and at the first possibility again will fight against Soviet Russian occupation for an independent Byelorussian state. In this way the Byelorussian people are natural allies of America and the Free World in the present global conflict between aggressive Soviet Russia and democratic countries. Therefore we consider it necessary to ask for the following:

1. Deal with and support the Byelorussian liberation problem the same as with those of all other Central and Eastern European nations;

2. Do not support the policy of "unpredetermination" of future for Byelorussia, propagated in the United States by some organizations hostile to the national-liberation movement of nations enslaved inside of the U.S.S.R.;

3. Accept as foundations for dealing with the Byelorussian problem the resolutions of the First and Second All-Byelorussian Congresses, and the proclamation of Independence of the Byelorussian Democratic Republic;

4. Include the Byelorussian language in the program of the Voice of America.